ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

ЧАЦВЕР
18 мая
№ 8(1726)
1995 года

## Ветэраны нашага універсітэта сёння



*Фота В. Літоміна*

## ● СВЯТЫ І БУДНІ

Адбылося святкаванне 50-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Рыхтаваліся да гэтага свята ўсе, але ў першую чаргу да свайго свята рыхтаваліся ветэраны. Менавіта ім мы ўдзячны за гэты «чырвоны» дзень у календары. Ва універсітэце прайшлі мерапрыемствы, галоўным арганізатарам якіх быў Савет ветэранаў БДУ: сустрэчы ветэранаў са студэнтамі, чытацкія канферэнцыі, экскурсіі ў музей Вялікай Айчыннай вайны, Хатынь, на Курган Славы. Ветэраны рыхтавалі і матэрыялы для кнігі Памяці, прысвечанай ўдзельнікам Вялікай Айчыннай — выкладчыкам, супрацоўнікам і студэнтам БДУ.

Трэба адзначыць, што рэктарат і прафсаюз не забываюцца на ветэранаў і ў будзённыя дні. Як паведаміла Старшыня Савета ветэранаў універсітэта Дударава Таццяна Ефімаўна, ветэранам палепшана жыллёвыя ўмовы, аказана матэрыяльная дапамога.

**А. КЛАСКОЎСКІ,**
**вучань 11 класа СШ № 55.**

## ● ВЕДАЙ НАШЫХ!

Прыемна павіншаваць каманду КВН БДУ, якая 22 красавіка ў Маскве выйшла ў 1/4 фіналу і здзівіла гэтым не толькі сваіх прыхільнікаў, але і сапернікаў. Гульня каманды была сапраўды цудоўнай, хаця ніколі не бывае так, каб не магло быць лепш. На гэтае «лепш» мы будзем спадзявацца, калі каманда КВН нашага універсітэта будзе зноў гуляць на сцэне Палаца моладзі. Адбудзецца гэта 20 мая. У 1/4 фіналу БДУ давядзецца сустрэцца з камандамі Тамбова, Махачкалы і Львоўскімі гусарамі.

**Ж. СІНІЦКАЯ.**

## ● ПАДПІСКА-95

З 20 красавіка па 31 мая праводзіцца падпіска на газеты і часопісы на трэці квартал 1995 года.

У каталогу рэспубліканскіх падпісных выданняў часопіс «Веснік БДУ» знайсці няцяжка: сярод падобных сабе ён адзін з самых танных. Падпісная цана па серыях такая:

*Серыя III* (інд. 74853) — гісторыя, філасофія, сацыялогія, эканоміка, права (№ 2 ліпень) — 6000 рублёў;

*Серыя IV* (інд. 74854) — філалогія, журналістыка, педагогіка, псіхалогія (№ 2 жнівень) — 6000 рублёў;

*Серыя I* (інд. 74851) — фізіка, матэматыка, механіка (№ 3 верасень) — 6000 рублёў.

Падпіска на часопіс «Веснік БДУ» прымаецца ва ўсіх аддзяленнях сувязі і прадпрыемстваў «Белсаюздруку».

Нагадаем, што ў рознічны продаж часопіс не паступае.

**РЭДАКЦЫЯ І РЭДКАЛЕГІЯ ЧАСОПІСА**

## АНОНС

***У карпусах гістарычнага і філалагічнага факультэтаў з'явіліся аб'явы аб тым, што ў сувязі з загадам Міністра абароны набор на ваенныя кафедры ў 1995-м годзе адбывацца не будзе. Рэдакцыя «Беларускага універсітэта» вырашыла высветліць сітуацыю з ваеннай кафедрай. Матэрыял аб гэтым чытайце ў бліжэйшы час.***

**З КАМПЕТЭНТНЫХ КРЫНІЦ**

## РЫХТУЙСЯ ЗАГАДЗЯ

**Факультэт дауніверсітэцкай падрыхтоўкі і прафарыентацыі моладзі Беларускага дзяржаўнага універсітэта аб'ядноўвае ў сабе падрыхтоўчае аддзяленне і падрыхтоўчыя курсы.**

На падрыхтоўчым аддзяленні могуць займацца асобы, якія маюць сярэднюю або сярэднеспецыяльную адукацыю. Навучанне вядзецца з адрывам ад вытворчасці. Зараз тут займаецца каля 130 чалавек. Па заканчэнні курса навучання слухачы падрыхтоўчага аддзялення здаюць выпускныя экзамены. Тыя, хто здаў экзамены на «выдатна», на «добра» і «выдатна» альбо толькі на «добра», залічваюцца на першы курс адпаведнага факультэта па-за конкурсам. Прыём дакументаў на падрыхтоўчае аддзяленне — з 4 кастрычніка па 20 лістапада.

Падрыхтоўчыя курсы спалучаюць розныя формы навучання:
— вячэрнюю (9-, 8-, 6-, 4-месячныя курсы);
— завочную (10-, 6-месячныя курсы);
— дзённую (2 тыдні перад уступнымі экзаменамі).

На курсы прымаюцца ўсе жадаючыя, якія маюць сярэднюю адукацыю. На 8-месячныя вячэрнія курсы, якія працуюць па суботах, прымаюцца толькі вучні 11 класаў г. Мінска.

З 19 чэрвеня пачнецца набор на 2-тыднёвыя курсы, якія будуць працаваць непасрэдна перад уступнымі экзаменамі з 1 па 15 ліпеня.

Штогод 35% слухачоў падрыхтоўчых курсаў становяцца студэнтамі універсітэта (сёлета тут займаецца каля 2000 чалавек).

Дадатковую інфармацыю можна атрымаць па тэлефонах 26-45-04, 20-85-39.

**А. КЛАСКОЎСКІ,**
**вучань 11 класа СШ № 55.**

## ● ЗАПРАШАЕМ НА ВЫСТАВУ

## «Адукацыя» — ва універсітэце

15—17 чэрвеня 1995 года на базе Беларускага дзяржаўнага універсітэта будзе праходзіць выстава-семінар «Беларусь. Адукацыя-95».

Яна пазнаёміць нас з апошнімі дасягненнямі ў галіне адукацыі, тэхнічнага і праграмнага забеспячэння, папулярызацыяй наватарскіх ідэй, школ, новых напрамкаў у навучанні, прадставіць інфармацыю аб магчымасці навучання за мяжой, наладжванні і развіцці кантактаў з замежнымі партнёрамі, якія спецыялізуюцца на працы ў галіне адукацыі і навукі.

Плануецца прадставіць наступныя раздзелы:

1. «Адукацыя і навука». Тут можна будзе пазнаёміцца з навучальным і навуковым абсталяваннем, тэхнічнымі сродкамі навучання, сістэмамі вывучэння замежных моў, аргтэхнікай, праграмным забеспячэннем, новымі напрамкамі ў адукацыі, наватарскімі ідэямі, школамі, самаадукацыяй і развіццём творчых здольнасцей асобы, здаровым ладам жыцця і культурай адпачынку і г.д.

2. «Міжнародныя адукацыйныя, навукова-даследчыя праграмы і турыстычныя праграмы». У гэтым раздзеле будзе прадстаўлена вывучэнне замежных моў, навучанне за мяжой, замежная мова і прафесія, адукацыйны турызм, турызм і навуковыя абмены і г.д.

3. «Выдавецтвы для адукацыі і навукі. Кніжны кірмаш».

4. «Беларускі дзяржаўны універсітэт». Тут будзе расказана пра факультэты і навуку.

У выставе прымуць удзел міжнародныя фонды, замежныя і айчынныя арганізацыі і фірмы, турбюро, выдавецтвы, пасольствы замежных краін, акрэдытаваныя ў Беларусі. Выстава разлічаная на вучняў, студэнтаў, спецыялістаў у галіне адукацыі, шырокія пласты насельніцтва.

Ва ўдзельнікаў будзе магчымасць змясціць інфармацыю аб сваёй арганізацыі і яе дзейнасці ў каталогу, на агульным тэматычным стэндзе, паказаць і рэалізаваць узоры сваёй прадукцыі, прыняць удзел у семінары і правесці прэзентацыю ўласных праграм, абсталявання.

Адкрыецца выстава 15 чэрвеня ў 10 гадзін па адрасу: 220050, Беларусь, г. Мінск, пр-т Ф. Скарыны, 4, пакой 214. Тэл.: (0172) 20-70-38, 20-64-69. Факс: (0172) 20-88-21.

**Валерыя АЎСЯНІК**

## АБ'ЯВЫ

*З 16 па 19 мая ў галоўным корпусе універсітэта праходзіць выстава-семінар «Інфарматыка-95». На ёй будуць разглядацца пытанні, звязаныя з гэтай важнай сучаснай сферай дзейнасці: «Агляд і параўнаўчы аналіз новага пакалення камп'ютэрнай тэхнікі», «Сучасныя камп'ютэрныя тэхналогіі і праграмнае забеспячэнне», «Праграмнае забеспячэнне бухгалтэрскіх сістэм», «Аўтаматызаваныя сістэмы кіравання навучальнымі ўстановамі».*

## ПРАГНОЗ

Да студэнта, які рыхтаваўся да іспыту, зайшоў прыяцель і пацікавіўся, ці шмат той паспеў прайсці.

— А вунь глянь — я заклаў у падручніку запалкай месца, да якога паспеў дабрацца.

Прыяцель узяў кнігу — запалка выпала.

— Ах, чорт яго бяры! — з жалем ускрыкнуў студэнт. — Прыйдзецца вучыць спачатку.

**● НА ВУЧОНЫМ САВЕЦЕ**

# СПРАВАЗДАЧА АБ НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧАЙ РАБОЦЕ УНІВЕРСІТЭТА ЗА 1994 ГОД

***На адным з нядаўніх пасяджэнняў Вучонага Савета слухаўся даклад аб навукова-даследчай дзейнасці універсітэта за 1994 год. Справаздачу рабіў Анатоль Іванавіч ЛЕСНІКОВІЧ, прарэктар па навуковай рабоце. Да вашай увагі — пачатак справаздачы.***

Паважаныя члены Савета і кіраўнікі навуковых калектываў!

Дазвольце ў пачатку ў якасці ўводзін спыніцца на фактах, якія даюць агульнае ўяўленне аб стане навукі ў нашым універсітэце на фоне яе стану ў рэспубліцы.

У галіне навукова-тэхнічнай дзейнасці ў Беларусі занята 0,53% усяго насельніцтва, або 1,12% работнікаў, занятых у народнай гаспадарцы. Гэта значыць, што колькасць работнікаў навукова-тэхнічнай сферы за апошнія гады ў Беларусі скарацілася больш чым у 2 разы і складае менш за 50 тыс. чалавек. Выходзіць, рэспубліка ўсутыч наблізілася да лічбы 35 тыс. чалавек, якую рэкамендуе Міжнародная Арганізацыя эканамічнага супрацоўніцтва і развіцця, беручы за падставу долю Беларусі ў сусветным багацці і эквіваленце поўнай занятасці насельніцтва адносна ЗША. Многія спецыялісты не згаджаюцца з ацэнкай гэтай арганізацыі, бо, напрыклад, у Японіі рэальны лік занятых у тры разы больш за рэкамендаваны; таму можна лічыць, што далейшае змяншэнне ліку навуковых работнікаў прывядзе да фактычнага разбурэння навуковай структуры ў Беларусі. У накірунку разбурэння яшчэ мацней дзейнічае змяншэнне рэальных затрат на гэту сферу; пры змяншэнні колькасці занятых у навуцы больш чым у два разы, расходы фармальна зменшыліся ў 8 разоў (яны склалі летась 0,5% ад аб'ёма нацыянальнага даходу — гэта ўзровень самых адсталых краін, прынамсі Бразілія, Мексіка і шэраг іншых краін сярэдняга ўзроўню развіцця выдаткоўваюць на навуку большую долю свайго бюджэту, чым РБ). У сапраўднасці змяншэнне затрат было яшчэ большым, бо нацыянальны даход таксама значна зменшыўся. Пры цяперашнім стане эканомікі запланаванае на 1995 г. прыблізна двухкратнае павелічэнне выдаткаў на навуку ў даходнай частцы бюджэту (з 1,8% да 2,85%) рэальна акажацца далейшым іх змяншэннем праз верагоднае змяншэнне даходнай часткі бюджэту.

Сярэдні заробак навуковых работнікаў складаў каля 1,8 кошту спажывецкага кошыку і быў ніжэй, чым сярэдні заробак у народнай гаспадарцы.

У пераліку на долары ЗША фінансаванне НДР ва універсітэце (разам з НДІ) у 1994 г. у параўнанні з 1993 г. зменшылася прыкладна з 730 тыс. да 500 тыс. долараў. Для ацэнкі гэтай сумы скажу, што, паводле падлікаў расійскіх спецыялістаў, падрыхтоўка аднаго навукоўца высокага ўзроўню каштуе 300—400 тыс. долараў, г. зн. рыхтуючы 2-3 доктараў у год, мы ўжо апраўдаем гэтыя выдаткі.

Колькасць навуковых супрацоўнікаў за год скарацілася ва універсітэце на 34 чалавекі, у асноўным за кошт НДІ ПФП. Кандыдатаў навук стала менш на 24 чалавекі, а доктараў — на 3. Павялічыўся сярэдні ўзрост навуковых супрацоўнікаў (47— для доктараў і 38 — для кандыдатаў), але не ПВС. Для параўнання: у АН РБ сярэдні ўзрост доктараў — 58, а кандыдатаў — 46 год. Значна менш у 1994 г. абаронена супрацоўнікамі БДУ кандыдацкіх дысертацый — 21, аднак лік доктарскіх абарон досыць стабільны — 14. Супрацоўнікамі АН РБ, якіх удвая болей, абаронена 20 доктарскіх і 59 кандыдацкіх дысертацый.

Нягледзячы на агульныя негатыўныя тэндэнцыі, у НДР універсітэта дасягнутыя і значныя поспехі. Пачну з тых, што атрымалі афіцыйнае прызнанне.

За цыкл работ «Флуктуацыі мікраструктуры і фотафізіка раствораў складаных арганічных злучэнняў» калектыву аўтараў, у складзе якога супрацоўнікі універсітэта Варапай Яўген Сямёнавіч, Гайсёнак Віктар Анатольевіч, Гуліс Ігар Міхайлавіч, Томін Уладзімір Ільіч, прысуджана Дзяржаўная прэмія Беларусі. У гэтых работах развіваюцца новыя фундаментальныя ўяўленні аб флуктуацыйна-дынамічным характары мікраструктуры раствораў складаных арганічных злучэнняў і яго вызначальнай ролі ў фарміраванні спектральных уласцівасцей і механізмаў асноўных фотафізічных працэсаў у такіх сістэмах, да ліку якіх адносяцца лазерныя асяродкі і асяродкі для аптычнага запісу інфармацыі, элементы фотасінтэтычнага апарату раслін, малекулярныя сістэмы для пераўтварэння сонечнай энергіі і інш.

За плённую навуковую работу Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета Беларусі прафесар НДІ ПФП Умрэйка Дзмітрый Сцяпанавіч узнагароджаны Ганаровай граматай. Дзмітрый Сцяпанавіч вядомы сваімі работамі ў галіне спектраскапіі комплексных злучэнняў і ў прыборабудаванні экалагічнага профілю. Па выніках конкурсу на прэмію БДУ яму, А. І. Камяку і Л. В. Валадзько (пасмяротна) прысуджаная прэмія імя А. Н. Сеўчанкі за манаграфію «Уранілавыя злучэнні», у якой дэтальна разгледжана будова і фізіка-хімічныя ўласцівасці шэрага злучэнняў урана — элемента, які ў значнай меры вызначае аблічча сучаснай ядзернай энергетыкі.

Прэмія імя У. І. Пічэты прысуджана прафесару кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права Юхо Іосіфу Аляксандравічу за сукупнасць работ па гісторыі дзяржавы і права Беларусі, якія запачаткавалі асновы новай галіны навуковых ведаў, асабліва актуальнай у перыяд станаўлення нашай дзяржавы.

Год таму адбыліся выбары ў АН Беларусі. Сапраўднымі членамі Акадэміі выбраны Ф. М. Капуцкі і А. Ф. Чарняўскі, а членамі-карэспандэнтамі П. Д. Кухарчык і дакладчык.

Шэраг навукоўцаў універсітэта быў выбраны ў грамадскія акадэміі, у тым ліку — міжнародныя і замежныя. Дарэчы, Акадэмія прыродазнаўчых навук Расіі і Асацыяцыя аўтараў навуковых адкрыццяў зноў пачалі рэгістрацыю навуковых адкрыццяў і за 1993—1994 гг. выдалі 7 дыпломаў на адкрыццё.

Міжнароднай Сорасаўскай праграмай адукацыі ў галіне дакладных навук выдзелены грант «Заслужаны Сорасаўскі прафесар» Старобінцу Г. Л., а «Сорасаўскі прафесар» — Лапаціну І. К., Свірыдаву В. В., Тышкевіч Р. І., Фамічову Ю. К., а таксама акадэміку Рубанаву А. С., які працуе ў БДУ па сумяшчальніцтву. З 11 Сорасаўскіх прафесараў амаль палова працуе ў БДУ.

80 студэнтаў БДУ атрымалі Сорасаўскую стыпендыю, пры прысуджэнні якой улічвалася іх навуковая работа. Атрыманы 14 доўгатэрміновых грантаў Міжнароднага навуковага фонду, 6 грантаў INTAS, падпісаны шэраг прамых кантрактаў з замежнымі партнёрамі. У суме доўгатэрміновыя гранты складаюць больш за 200 тыс. долараў. Адлічэнні ад грантаў, а гэта каля 20%, дазволілі НДІ ФХП набыць сучасны вылічальны комплекс RISK-6000/250 коштам звыш 20 тыс. долараў, на базе якога ў бягучым годзе будзе створана лакальная сетка ў хімічным корпусе ў інтарэсах інстытута і факультэта.

Інфармацыйна-вылічальны цэнтр вядзе работы па развіццю сродкаў тэлекамунікацыйнага доступу да міжнародных камп'ютэрных сетак, выкарыстоўваючы грант фонда «Еўразія», па якому закуплена абсталяванне і праграмных сродкаў на 13 тыс. долараў.

Упраўленне міжнародных сувязей правяло вялікую работу па падрыхтоўцы і падпісанню чатырох падпраектаў у рамках праграмы TEMPUS, у выніку толькі на стадыі падпраектаў закупілі тэхнікі на 60 тыс. экю, а ў 1995 г. для абсталявання бібліятэкі будзе выдзелена прыблізна 100 тыс. экю.

Фонд Сорас-Беларусь у рамках праграмы «Трасфармацыя гуманітарнай адукацыі ў Беларусі» вызначыў пераможцаў 1-га конкурсу, сярод якіх 6 выкладчыкаў, 21 аспірант і 25 студэнтаў БДУ, і выдзеліў ім гранты тэрмінам на 6 месяцаў. 12 грантаў на напісанне навучальных дапаможнікаў атрымалі выкладчыкі філалагічнага, гістарычнага і механіка-матэматычнага факультэтаў.

У цэлым фінансаванне, атрыманае па міжнародных праектах, праграмах і фондах (ацэнкава яно складае блізу 300 тыс. даляраў), можна супаставіць з фінансаваннем з унутрырэспубліканскіх крыніц, што дазваляе казаць аб прынцыповых якасных зменах у фінансаванні НДР ва універсітэце, аб тым, што універсітэт паспяхова адаптуецца да новых умоў, а выкладчыкі і навуковыя супрацоўнікі пачалі актыўна ўключацца ў міжнародныя праекты, дэманструючы высокі міжнародны ўзровень сваіх даследаванняў і распрацовак. Важна замацаваць гэты поспех і ў далейшым. У сувязі з гэтым хачу звярнуць увагу, што ў 1995 г. удвая павялічваецца аб'ём фінансавання па Беларускаму Фонду Сораса, і ён дасягне 5 млн. долараў.

## НАЙВАЖНЕЙШЫЯ НАВУКОВЫЯ ВЫНІКІ

У мінулым і на пачатку гэтага года Савет універсітэта заслухоўваў справаздачы факультэта журналістыкі, ММФ, НДІ ПФП і НІЦ, таму, пераходзячы да канкрэтных вынікаў навуковай дзейнасці, я не буду закранасць гэтыя падраздзяленні. Канешне, у дакладзе я не магу паглыбляцца ў малазразумелыя неспецыялістам дэталі і спынюся толькі на некаторых прыкладах.

Па факультэту прыкладной матэматыкі і інфарматыкі хацелася б адзначыць работу кафедры матэматычнага мадэлявання і аналізу данных, дзе створана сістэма праграмнага забеспячэння ПЭВМ у галіне прыкладной статыстыкі, якая складаецца з 6 пакетаў прыкладных праграм. Распрацаванае навукаёмістае праграмнае забеспячэнне разлічанае на шырокае кола карыстальнікаў і дазваляе вырашыць задачы камп'ютэрнага аналізу статыстычных данных у эканоміцы, медыцыне, тэхніцы, навуковых даследаваннях і іншых дадатках. За апошнія два гады заключана 17 дагавораў на пастаўку гэтага праграмнага забеспячэння прамысловым прадпрыемствам, НДІ, камерцыйным банкам РБ; ППП «Ростан» прадалі Мюнхенскаму універсітэту.

Супрацоўнікамі НДІ ЯП быў выкананы вялікі аб'ём работ, звязаны з даследаваннем монакрышталічных сцынтылятараў. Прапанаваныя для прымянення ў электрамагнітным каларыметры ў ЦЕРН (Швейцарыя) крышталі паказалі ў ходзе выпрабаванняў найлепшыя характарыстыкі ў параўнанні з іншымі тыпамі сцынтылятараў, і кіраўніцтва ЦЕРНа прыняла гэтыя крышталі ў якасці базавых. Гэта азначае, што з 1995 г. каларыметр буйнейшага ў свеце эксперымента па фізіцы высокіх энергій будзе ствараца на базе крышталяў, распрацаваных і дэтальна вывучаных супрацоўнікамі НДІ ЯП. Для інстытута факт прыняцця гэтага рашэння азначае ўдзел у дзесяцігадовай міжнароднай праграме па стварэнню і мадэляванню эксперыментальнай устаноўкі. На працягу гэтых год супрацоўнікі Інстытута атрымаюць доступ да работы з унікальным абсталяваннем ЦЕРНа, што дазволіць не толькі захаваць навуковыя кадры, але і падрыхтаваць маладых высокакваліфікаваных спецыялістаў, здольных прадстаўляць Беларусь у буйных міжнародных праектах.

Супрацоўнікамі фізічнага факультэта створана аўтаматызаваная сістэма ранняга выяўлення лясных пажараў. Створаная ва універсітэце сістэма прайшла эксперыментальную праверку ў Мядзельскім лясніцтве. Высокая эфектыўнасць яе дасягаецца за кошт замкнутай архітэктуры з адзіным цэнтральным пунктам назірання, кіравання і кантролю ўсёй сістэмы, куды збягаецца тэлевізійная інфармацыя з кожнага пункта назірання.

На кафедры фізікі паўправаднікоў іённай імплантацыяй палімерным плёнкам нададзены ўласцівасці, якія дазваляюць атрымаць з гэтых плёнак эластычныя і танныя мініяцюрныя элементы электроннай тэхнікі.

Кафедрамі фізічнага і радыёфізічнага факультэтаў распрацаваныя прыборы для дыстанцыйнага вызначэння тэмпературы, якія адрозніваюцца дыяпазонам вымяраемых тэмператур. Адзін з іх ужо прайшоў метралагічную атэстацыю ў Харкаўскім інстытуце метралогіі; другі выраблены НІЦ у колькасці 3 штук, ён паспяхова дэманстраваўся на выстаўцы «Белвузнаука» і на Лейпцыгскім кірмашы. Пасля метралагіравання ён намечаны да выпуску малой серыяй у НІЦ.

Кафедра фізічнай электронікі паспяхова развівае работу па стварэнню на базе НДЦ вытворчай лініі іонапрамянёвай і вакуумна-плазменнай мадыфікацыі паверхні прамысловых вырабаў і прадметаў ужытку.

На кафедрах арганічнай хіміі і ВМЗ, радыяцыйнай хіміі і хімтэхналогіі сінтэзаваны шэраг злучэнняў, якія валодаюць важнымі відамі біялагічнай актыўнасці, і праводзіцца актыўная работа па стварэнню на іх аснове новых лекавых прэпаратаў. Атрыманыя арганічныя рэчывы па кантракту з БДУ купляюць замежныя фірмы па дастаткова высокіх цэнах.

Пры правядзенні радыёхімічных даследаванняў па тэмах, звязаных з ліквідацыяй наступстваў аварыі на ЧАЭС, выяўлена, што з цягам часу назіраецца змяншэнне ўтрымання «гарачых» часціц у глебах за кошт іх паступовага разбурэння. Аднак распаўсюджанасць «гарачых» часціц па тэрыторыі рэспублікі ўсё яшчэ застаецца значнай, доля β-актыўнасці, звязаная з імі, дасягае 28% агульнай β-актыўнасці верхняга слоя глебы.

ЭТК «Аналіз-Х» выпусціў і рэалізаваў оптавыя партыі шэрага дыягнастычных набораў, наладзіў іх серыйны выпуск у аб'ёме попыту Беларусі. Падрыхтаваныя тэхнічныя ўмовы на методыкі вызначэння каштоўных металаў. Методыкі ўведзеныя ў практыку Дзяржаўнай лабараторыі прабірнага аналізу.

У рамках Рэспубліканскай праграмы стварэння дзяржаўных запасаў каштоўных металаў і каштоўных камянёў НДІ ФХП, хімічным факультэтам і НІЦ распрацавана тэхналогія і створана даследчая вытворчасць па атрыманню металаў з розных відаў прамысловых адходаў, а таксама распрацаваны тэхналагічныя працэсы атрымання з іх шэрага хімічных прэпаратаў і спецматэрыялаў. Усё гэта дало дзяржаве прадукцыі на суму каля 3,5 млрд. руб.

Па заказу Белкаштмета было падрыхтавана тэхніка-эканамічнае абгрунтаванне вытворчасці па комплекснай перапрацоўцы лома і адходаў з утрыманнем каштоўных металаў, падрыхтаваны тэхнічны праект і за кошт крэдытаў пачатая рэканструкцыя корпуса Навукова-інжынернага цэнтра БДУ для размяшчэння на яго базе 12 тэхналагічных ліній па атрыманню металаў агульнай магутнасцю да 1,5 т у год.

Найбольш перспектыўныя навуковыя распрацоўкі на біялагічным факультэце, якія маюць практычнае значэнне:

— працэс атрымання ільновалакна з ільносаломкі метадам цвёрдафазнай ферментацыі, які паскарае тэрміны перапрацоўкі ў 2-3 разы, павялічвае выхад доўгага валакна, паляпшае ўмовы працы, экалагічна больш чысты;

— тэст-сістэмы аднаразовага прымянення ў пазалабараторных умовах для экспрэс-аналізу наркатычных сродкаў. Малекулярна-біялагічны метад і спосаб біялагічнай экспертызы, які дазваляе ідэнтыфікаваць асобу з верагоднасцю 99,99% па любых узорах вадкасцей і тканак чалавека.

Апошнія дзве распрацоўкі выканала кафедра біяхіміі сумесна з НДІ праблем крыміналогіі, крыміналістыкі і судовых экспертыз, яны ўведзены ў практыку для правядзення экспертыз па грамадзянскіх ісках (выяўлення бацькоўства) і экспертыз па крымінальных справах (забойства і згвалтаванне).

Кафедра фізіялогіі раслін распрацавала экспрэс-метады экалагічнага кантролю воднага асяроддзя і тэставання біялагічнай актыўнасці хімічных злучэнняў.

У НДЛ малекулярнай генетыкі бактэрый распрацаваны біяпрэпарат комплекснага дзеяння, які змяншае захворванне раслін на 25—70%, прызначаецца для абароны сельскагаспадарчых раслін ад паражэння фітапатагенамі і біястымуляцыі росту раслін.

На кафедры батанікі працягваецца работа па выяўленню раслін, якія належыць ахоўваць. Выведзеныя сорты таматаў для плёнкавых цяпліц, якія на 20—60% пераўзыходзяць стандарты ўраджайнасці і трываласці да захворванняў.

Геаграфічны факультэт падрыхтаваў навуковае заключэнне аб мэтазгоднасці стварэння Магілёўска-Свіслацкага нацыянальнага парка. Складзены прагноз змены тарфяных асушаных глеб на 2015 год для ўсіх раёнаў і адміністрацыйных абласцей Беларусі. Выканана ландшафтна-экалагічнае абгрунтаванне тэрытарыяльнага ўпарадкавання і супроцьэразійнай абароны зямельнага фонду ў адносінах да ландшафтаў Беларускага Паазер'я. Выканана экспертыза і зроблена экалагічнае заключэнне на здабычу сапрапеля і правядзенне меліярацыйных работ на водазборах трох азёр Віцебскай вобласці.

На кафедры філасофіі і метадалогіі навукі працягнутыя даследаванні сацыяльна-экалагічнага характару. Прапанаванае рашэнне шэрага задач, датычных распрацоўкі праграмы асветы ў гэтым накірунку.

На базе кафедры праведзеная міжнародная канферэнцыя «Філасофія сацыяльнага дзеяння і перспектывы», матэрыялы якой апублікаваныя ў зборніку і манаграфіі.

На кафедры сацыялогіі распрацаваная сістэма каштоўнасных арыентацый палітычнай эліты Беларусі, складзена рэспубліканская праграма падрыхтоўкі моладзі да сямейна-шлюбных адносін, распрацаваныя практычныя рэкамендацыі ўладным структурам па развіццю маладой сям'і. Распрацаваная методыка замеру фактараў, якія ўплываюць на фармаванне маладога спецыяліста, а таксама канцэпцыя універсітэцкай адукацыі ў рэспубліцы, створаная сістэма маніторынгу вышэйшай школы і сярэдняй адукацыі.

Кафедрай эканамічных навук разам з кафедрай матэматычнага мадэлявання і аналізу данных здзейснена распрацоўка эканоміка-матэматычных, кібернетычных і камп'ютэрных мадэлей працэсаў мікра- і макраэканомікі з мэтай дзяржаўнага рэгулявання эканомікі ў Рэспубліцы Беларусь.

Кафедрамі юрыдычнага факультэта распрацаваныя рэкамендацыі па ўдасканаленню палітычнай сістэмы грамадзянскага грамадства, якое складваецца ў Беларусі, па відах прафілактыкі эканамічных злачынстваў, па прававому рэгуляванню гаспадарчай дзейнасці і чыгуначных зносін між Беларуссю і іншымі дзяржавамі.

Гістарычны факультэт — у ліку лідэраў па колькасці выдадзеных кніг і дапаможнікаў, саступаючы па гэтаму паказчыку толькі геаграфічнаму і філалагічнаму факультэтам. Кнігі прысвечаныя як актуальным пытанням сучаснасці (манаграфія А. А. Разанава і А. В. Шарапы «Бяспека: падыходы Захаду»), нядаўняй мінуўшчыне («Шлях Беларусі ў ААН, 1944—1945 гг.» Снапкоўскі В. Е.), у тым ліку і прысвечаныя 50-годдзю перамогі ў Другой сусветнай вайне, так і больш аддаленага перыяду («Эсеры ў Беларусі» Брыгадзін П. І.) і інш. Актыўна на міжнародным узроўні развіваюцца работы па гістарычнай інфарматыцы ў Беларусі пад кіраўніцтвам праф. Сідарцова У. Н.

Супрацоўнікі філалагічнага факультэта апублікавалі 21 кнігу, сярод якіх вызначаюцца «Актуальнае моваведанне» (Плотнікаў Б. А.), «Слоўнік антонімаў беларускай мовы» (Лазоўскі У. М.), вучэбны дапаможнік «Рыторыка» (Мурына Л. А.).

Хацеў бы адзначыць, што заўважна актывізаваліся навуковыя даследаванні на кафедры медпадрыхтоўкі і кафедры фізвыхавання.

***(Працяг у наст. нумары).***

## ● СТАРОНКІ ГІСТОРЫІ

# ЧЭРСКІ ЯН ДЗЯМЕНЦЬЕВІЧ (да 150-годдзя з дня нараджэння)



Сусветная навука, усё прагрэсіўнае чалавецтва адзначае 150-годдзе з дня нараджэння вялікага навукоўца-прыродазнаўцы і падарожніка, выдатнага сына зямлі беларускай Яна Дзяменцьевіча Чэрскага.

Я. Д. Чэрскі нарадзіўся 3 (15) мая 1845 г. у радавым маёнтку Сволна Дрысенскага павета Віцебскай губерніі (цяпер Верхнядзвінскі раён Віцебскай вобласці), у сям'і беларускага шляхціца. Ен атрымаў цудоўную «арыстакратычную» адукацыю (бацькі самым сур'ёзным чынам клапаціліся аб яго салонным выхаванні), дасканала валодаў французскай, нямецкай, англійскай і лацінскай мовамі.

У 1860 г. Ян быў накіраваны ў Вільню для працягу адукацыі ва Урадавым (шляхецкім) інстытуце. Усебаковая адукаванасць юнака здзіўляла навакольных, ён не ведаў роўных сабе ў бальных танцах, выдатна музіцыраваў на фартэп'яна, пісаў пейзажы — ва ўсім выяўляліся яго высокія здольнасці да свецкага жыцця.

Праз 3 гады ён з юначым задорам уступіў пад сцягі Кастуся Каліноўскага, быў арыштаваны за ўдзел у вызваленчым руху і асуджаны Віцебскім Ваенна-палявым судом на бестэрміновую ссылку ў Сібір з канфіскацыяй маёнтка (бацька памёр у 1855 г.) з пазбаўленнем дваранскага тытула.

У дарозе па этапу да месца ссылкі (г. Омск) Я. Д. Чэрскі сышоўся з адным з паплечнікаў К. Каліноўскага вядомым геолагам М. Л. Чаканоўскім (1833—1876), які абудзіў у ім цікавасць да праблем «геалагічнай геаграфіі». Гэтая сустрэча стала лёсавызначальнай, яна прадвызначыла далейшы жыццёвы шлях Чэрскага. Гады знаходжання ў Омскай ссылцы сталі гадамі настойлівага і самазабыўнага вывучэння прыродазнаўчых навук, чаму спрыялі «творчыя сувязі» з падарожнікам Р. М. Патаніным, бібліяфілам В. І. Квяткоўскім і акадэмікам А. Ф. Міндэндорфам, якія жылі ў Омску.

У 1869 г. у сувязі з абвастрэннем хваробы сэрца Ян Чэрскі быў пераведзены з казармы лінейнага батальёна, дзе ён служыў рэкрутам, на вольнае пасяленне ў Омску. Чэрскі адразу ж звярнуўся да пецярбургскіх уладаў з просьбай аб пераездзе ў Казань для наступлення ва універсітэт. Аднак у гэты час ва універсітэцкіх цэнтрах Расіі віраваў падпольны рэвалюцыйны рух, і вобраз ссыльнага ў студэнцкай форме для царскіх саноўнікаў быў малапрывабным. Яму адмовілі.

Зіяўляецца першая яго навуковая работа «Нарыс геагнастычнай будовы наваколля г. Омска», якая абвергла сцвярджэнне славутага нямецкага прыродазнаўцы А. Гумбальта (1769—1859) аб тым, што ў геалагічнай мінуўшчыне Паўночны Ледавіты акіян злучаўся з Аральскім, Каспійскім, Чорным і Міжземным марамі. Гэта быў значны поспех маладога даследчыка, адзначаны ў сталічных колах. Па хадайніцтву акадэміка А. Ф. Мідэндорфа (1815—1894) Чэрскага пераводзяць увосень 1871 г. на вольнае пасяленне ў Іркуцк — «сталіцу Сібіры», цэнтр золатапрамыслоўцаў і ссыльных навукоўцаў — для работы ў Сібірскім аддзеле Расійскага Геаграфічнага таварыства (САРГТ).

Пасля няўдачы з Казанскім універсітэтам ён імкнуўся ў гэты горад, дзе знаходзіўся адзіны (на велізарнай прасторы ад Урала да Ціхага акіяна) ачаг ведаў і асветы, цэнтр навукі і культуры — САРГТ. Асаблівую групу даследчыкаў складалі выгнанікі 1863 г., і сярод іх — ужо вядомы яму Чаканоўскі і прафесар Варшаўскага універсітэта У. І. Дыбоўскі (1833—1930). Чэрскага прымаюць на работу адразу на тры пасады — бібліятэкара, пісара і кансерватара музея; яму даручаюць экспедыцыі на тэрыторыі Іркуцкай губерніі з мэтай геолага-геаграфічнага даследавання Усходняга Саяна. Амаль у кожным выпуску «Вестак Геаграфічнага таварыства» выходзяць арыгінальныя артыкулы Я. Д. Чэрскага паводле матэрыялаў даследаванняў горных сістэм Прыбайкалля.

За геаграфічныя даследаванні яго ўзнагароджваюць срэбраным медалём Імператарскага Геаграфічнага таварыства (1876), а за геалагічныя даследаванні — малым залатым медалём (1878).

У той час адукаваныя аўтарытэты ў галіне прыродазнаўства спрабавалі разгадаць таямніцы паходжання Байкала — найглыбейшага возера свету (1673 м) на плошчы 32 тым. км², з 22% сусветных запасаў прэснай вады. У апошняй чвэрці XIX стагоддзя, мусіць, ніводзін геолаг Расіі не быў так падрыхтаваны для даследаванняў праблем Байкала, як Чэрскі. І ў 1877 г. Геаграфічнае таварыства паставіла перад ім складаную задачу — комплекснае вывучэнне ўзбярэжжа Байкала па ўсяму перыметру гэтага унікальнага аб'екта прыроды. За 4 гады на грані грамадзянскага подзвіга Чэрскі зрабіў практычна немагчымую для аднаго чалавека работу па складанню 10-вёрстнай геолага-геамарфалагічнай карты Байкала, якая выкарыстоўвалася на практыцы аж да 40-х гг. XX ст. і зараз не згубіла свайго навуковага значэння. Карта была прадстаўленая на Міжнародным Геаграфічным кангрэсе ў Венецыі, а яе аўтар заваяваў сусветную вядомасць.

Увесну 1885 г. Акадэмія навук прапанавала Чэрскаму правесці шырокамаштабнае геолага-геаграфічнае абследаванне Сібірскага тракта ад Іркуцка да Урала. Зноў, і менавіта яму, даручаецца мерапрыемства, грандыёзнае па аб'ёму работ. Але на гэты раз тут і справа дзяржаўнай важнасці — па экспедыцыйна-картаграфічных матэрыялах Чэрскага намячалася праектаванне Транссібірскай чыгуначнай магістралі (па яго ж матэрыялах ажыццяўлялася і праектаванне Кругабайкальскай чыгункі — унікальнага помніка тэхнічнай думкі Расіі пачатку XX ст.).

Па завяршэнні гэтай экспедыцыі Чэрскаму належала з'явіцца ў Пецярбург для выканання заданняў Акадэміі навук і Рускага Геаграфічнага таварыства (РГТ). Гэта азначала, што РГТ нарэшце дамаглося канчатковага «даравання» Яну Дзяменцьевічу за «памылкі маладосці» (сам Сямёнаў-Цян-Шанскі прасіў цара за Чэрскага). Яму вярталіся шляхецкія правы. Канец 22-гадовай ссылцы! Юнаком перайшоў Чэрскі праз Урал, пакінуўшы за спіной беларускае неба, блізкіх людзей. І цяпер яму зноў трэба перайсці Уральскія горы, але ў зваротным кірунку. Перспектыва пабачыць Віцебшчыну прыемна шчыміла хворае напрацаванае сэрца.

Чэрскі з жонкай Маўрай Паўлаўнай і малагадовым сынам пакідае сталіцу «залатых міражоў» і кідаецца ў звыклую экспедыцыйную стыхію. Тут ён робіць тры маршруты ўбок ад асноўнага: на Ангары — да Падунскага парога і ў Краснаярску — па Енісею і па Мінусінскай катлавіне.

Усё гэта, з улікам ранейшых даследаванняў у раёне Байкальскага амфітэатра, дазволіла яму ўпершыню намаляваць стройную палеагеаграфічную карціну Сібіры паміж Ябланавым і Уральскім хрыбтамі (Вялікі Залаты медаль імя Ф. Літке, 1886).

Перадавыя навукоўцы Пецярбурга з захапленнем сустрэлі Чэрскага на берагах Нявы. Яму была прапанаваная работа ў Заалагічным музеі Акадэміі навук (яго інтарэсы ў галіне палеанталогіі і заалогіі заўжды спадарожнічалі геалагічным); з улікам стану здароўя (хранічная хвароба сэрца, астма, туберкулёз, раматус) кабінетная 16-гадзінная праца стала ўдвая больш прывабнай. Адусюль ён атрымлівае зманлівыя прапановы выступіць з дакладам, адрэдагаваць кнігу, напісаць артыкул. «Лепшы знаўца Сібіры» — рэпутацыя, якая адразу ж замацавалася за Чэрскім у навуковых колах расійскай сталіцы.

Чэрскі пражыў у Санкт-Пецярбургу 5 гадоў (1886—1991). У гэты перыяд ён па рэкамендацыі Прэзідэнта РГТ П. П. Сямёнава-Цян-Шанскага поўнасцю «перапісвае» састарэлае шматтомнае «Землязнаўства Азіі» Карла Рытэра (1779—1859) на падставе ўласных шматгадовых даследаванняў Усходняй Сібіры. У параўнанні з вульгарным геаграфізмам Рытэра погляды Чэрскага на фізіка-геаграфічныя ўмовы Сібіры з'явіліся глыбока прагрэсіўнымі і пераканаўчымі. Многія яго працы, і зараз не страціўшы навуковае каштоўнасці (тэорыя эвалюцыйнага развіцця рэльефа, палеатэктанічная схема Усходняй Сібіры, араграфічная схема Паўночнай Азіі і інш.), прынеслі апантанаму і самазабыўнаму даследчыку рэпутацыю «геалагічнага географа» і падарожніка сусветнага маштабу.

Узімку 1891 г. Я. Д. Чэрскі па заданню Акадэміі навук накіроўваецца з Пецярбурга ў Калыма-Індыгірскую экспедыцыю па амаль недаследаванаму краю Сібіры, які заставаўся белай плямай на геаграфічнай карце Расіі. Рашэнне абсалютна хворага навукоўца на шматгадовую экспедыцыю ў суровы паўночны ўсход Сібіры (з жонкай і 12-гадовым сынам) і сёння, у век авіялайнераў і надзейнай радыёсувязі, успрымаецца як акт агромнай грамадзянскай мужнасці. Тут асабліва каштоўнымі аказаліся геаграфічныя меркаванні Чэрскага па горных збудаваннях паміж Верхаянскім хрыбтом і ракой Калымой. У блытаніне рознанакіраваных горных ланцугоў, пройдзеных яго экспедыцыяй летам 1891 г., яму удалося выявіць пануючую заканамернасць. Гэтыя меркаванні, пакладзеныя на карту, былі поўнасцю пацверджаныя ў XX ст. лепш аснашчанай экспедыцыяй С. У. Обручава, па прапанове якога гэтая горная краіна працягласцю 1500 км была названая «хрыбтом Чэрскага».

25 чэрвеня 1892 г. стан здароўя Яна Дзяменцьевіча рэзка пагаршаецца, і ён памірае на экспедыцыйным баркасе ў нізоўях Калымы. Першага чэрвеня М. П. Чэрская хавае 47-гадовага мужа ў заімцы ля вусця Амалона — прытока Калымы. Яна давяла экспедыцыю да Ніжне-Калымска і даставіла экспедыцыйныя матэрыялы ў Іркуцк. Вестка аб смерці Чэрскага была перададзена па тэлеграфу ў сталіцу Расіі і адразу ж прыцягнула ўвагу расійскага грамадства.

Чэрскі вялікі і як падарожнік, і як навуковец, і як грамадзянін-патрыёт. Яшчэ пры жыцці заслужыў ён сусветную славу, але яна так і не кранулася яго — прайшла міма, як лёгкі воблак над сібірскай тайгой. Чалавек трагічнага лёсу, ён пражыў усё сваё свядомае жыццё удалечыні ад Радзімы, але заўжды быў верны беларускаму народу.

**Валерый ЯРМОЛЕНКА,**
**горны інжынер, доктар геаграфічных навук.**

## ● ФОТАРЭПАРТАЖ

# УСПАМІНЫ ДА СЕЗОНА КАНІКУЛ І АДПАЧЫНКАЎ



Бліжэй да лета ажывае турысцкае племя. Імкненне да падарожжаў у людзях — невыкаранядьнае, і найлепей яго рэалізаваць з выкарыстаннем актыўных спосабаў перамяшчэння. Знайдзіце летам час для сапраўднага турысцкага пахода.

Каўказ і Фанскія горы — вось улюбёныя месцы не аднаго пакалення турыстаў. У гэтых мясцінах пабывалі вельмі многія турысты БДУ, становячыся ўпершыню на горную сцяжыну або праходзячы складаны маршрут. Цяпер туды наўрад ці ляжа дарога: транспартныя праблемы, дарагоўля, адсутнасць выратавальнай службы, межы-мытні і — самае сумнае — войны. Павабяць іншыя дарогі, і зусім не абавязкова дальнія.

Аднак, збіраючыся ў падарожжа, давайце ўзгадаем тыя мясціны, яркія ўражанні аб наведванні якіх заўжды хочацца перажыць яшчэ раз.

Тут публікуюцца фотаздымкі, зробленыя Ю. У. Цішыным, які трагічна загінуў у горах, аб чым нядаўна пісала наша газета.

**А. П. ШЫЛІН**

***Фанскія горы: возера Вялікае Ало — жамчужына гэтых мясцін.***

***Каўказ: па Караўгомскаму ледападу.***

***Фанскія горы: Ю. У. Цішын арганізуе спуск таварышаў з перавала Юбілейны.***





# МАЙСТРОЎНЯ


*Рэдакцыя газеты «Беларускі універсітэт» прадстаўляе будучага, спадзяемся, студэнта БДУ, які прадаставіў нам свае творы. Рэдакцыя мае надзею, што гэта не апошняе з'яўленне гэтага аўтара на нашых старонках. Правапіс аўтара твораў захаваны.*

## Зь нізкі «Катэгорыя Вандраваньня»

### Гаспадар Л.

* * *

Калі прыціхае вечар,
А магчыма проста зьнікае
нешта,
Паміж гонкім праходам
дрэў вырастае мур,
Я заходжу ў дворык і
дыхаю
Мэтафізікай страчаных
вуліц.

Ў падземных сутарэньнях
майго дома,
Працуюць, што ў пекле,
качкі.
У паўсьне паўстае мая
радасьць,
Гледзячы проста ў вакно:
Там паляць сьвятло.
І я занікаю поруч,
забіваю ўсе свае думкі,
Старая шурпатая лава.
будзе найлепшым
прытулкам
Ў такім прыпадку.

* * *

Калі мяне нарадзілі,
я проста зваліўся на рукі,
як паранены, але яшчэ не
забіты
нядзельным раньнем
вяпрук —
так грукала маё сэрца.

Калі я ўзьняўся на ногі і
нясьмела пайшоў
па каберцу з восеньскай
жарствы —
самотнай высьпе жоўтага
флёту жагляроў —
І тады мне казалі:
«глядзі, гэта — лістапад».

Маленькі хлопчык пазіраў
на вялікае лісьце,
што шырокімі ануча́мі і
багранымі
плямамі засьцілала блакіт
паветра
і пакідала волатаў —
голымі,
Тады путны баярын вецер
хапаў іх за шыю,
за талію, як гвалтаўнік
жанчыну,
і нёс,
і зносіў па шэрай рацэ
асфальта,
дзе ляжала часьціна іх
брацтва.

І самотнае лісьце
заставалася ў пераходах
грала на гармоніку й
спрачалася
і Баянам апявала вечнае
незваротнае
невыноснае, за мяне
старэйшае,
вандраваньне лёзных
людзей.

### Насеньне Шывы

**Мне ў сэрца траплялі
стрэлы,
І на шыбінах і
падваконьнях,
На альвасах і кветніках
столі.
І тады на стромнях
вады,
Прысьпетай у час
падзеньня,
Ўсюдых красавалі кветкі
Варожасьці і каханьня,
Пошасьці і адданьня,
Суровага выраку сьмерці,
І стомы ў сяйве
крутаверці.**

**Я бачыў волкія вершы,
Наданыя сэнсам млосьці.
Крыўдай таго, хто просіць
Няшчымным зьвячэлым
целам
На паперці і цьвінтары:
Адхланьне Насеньня
Шывы.**

**Ня здатны трымцець бяз
памяці,
Як дрэвы пад ветрам
начным
Апошнім потыхам руху.
Ня здатны імя даваць
Суцэльным казаньням
прарочым,
Ня здатны маланку
трымаць,
Што сьлізгае сквілам
вужачым,
Ня здатны трываць нуду,
І ў сэрцы хаваць стралу.**

**Нямогласьць цярпець
дазваньня.
Нібы праклён
звышпродкаў,
Пякучым сьвітаньнем
сонца —
Загад агаленьня
пустыні —
Пякельнасьць Насеньня
Шывы.**

* * *

Той, хто прачнуўся,—
заўжды кансерватар.
Вонках
чаўпецца
сьнег.
Па ганку з каменьняў,
падваліне зь берняў,
Нячутна
ступае
зьвер.
У сутарэньнях
заблытаўся вецер
Між тушы
і гольля
дрэў.
А зьвер папікае
і злосна рагоча
З блазенства
дамашніх
сьцен.
Той, хто прачнуўся,
выходзіць на поле,
Мерае
зіркам
абсяг.
Фіранкі з аблокаў
рукой растуляе,
І свой
вызначае
час.
Па торгах у венах,
далоняй дапаўшы,
Спакойны рух
срэбнай
крыві.
Атрамантам зельля,
летнім насеньнем
Сабе
напісаны
лісты.

## Юлия Волошенко

*Редакция газеты «Беларускі універсітэт» представляет студентку II-го курса факультета журналистики БГУ Юлию ВОЛОШЕНКО.*

* * *

Уйти тогда, когда нельзя
Вдруг закричать и
хлопнуть дверью.
Понять, что грешная стезя
Ведет в манашескую
келью.

Молиться детскому божку,
Сжимая зубы, плача
кровью.
И доверять себя сверчку,
Живущему в твоём
подполье.

* * *

**О, Ваше Величество-...
Время!
Я перед мудростью Вашей
Снова встаю на колени,
Чтобы испить из чаши
Лёгкую сладость победы,
Горькое пораженье...
В Вас я ищу ответы,
У Вас же молю прощенье.
Ваше Величество Время,
Гордый и жесткий
учитель,
Сколько же поколений
Входило в Вашу
обитель?**

* * *

Я верю в какой-то бред,
Читаю одну лишь сказку,
Живу по чьей-то
подсказке
И знаю, что счастья нет.





* * *

**Не вернуть, не забыть,
дожди...
Разревелся февраль под
вечер.
И в желаньи согреться
к груди
Прикоснулся, обняв за
плечи.**

**Я встречаю вчерашний
день.
Мы и прежде встречались
зачем-то.
На дорогу ложится тень.
Тень Вчера, забытая
кем-то.**

* * *

Гололёд. Голоненависть.
Гололюбовь.
Равнодушие голое, голые
стены.
Обжигаются ноябрьским
холодом вновь
Сонной и вечной болью
чуть вздутые вены.
Я и голым, и липким
молилась Богам,
Верой склонялись в
дерзком почтеньи к
стопам,
называя своей королевою
ада.
Голый смех. Снова в
нервах нерезкий рывок.
Забываются детские
добрые сказки...
Да, я нынче дерзкий,
нахальный зверёк.
Да, я детёныш жизни,
рыжехвостой ласки.

* * *

**Засыпаю зимним сном,
Засыпаю душу снегом,
В этой комнате вдвоём
Мы оправились от бега.
Мы бежали от тревог
Из жестокого
пространства.
Ты, увы, мне дать не смог
В этом мире постоянства.**

**Засыпает светлячок —
То слегка всплакнула
свечка.
Греет темень кулачок
У горячей доброй печки.**

**Засыпаешь зимним сном,
Засыпаешь душу
снегом...
Мы не будем здесь вдвоём.
Я вернусь к шальному
бегу.**


БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.

18 мая

Зак. 656.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4,

В. а. рэдактара
Т. М. КАЗАК